6. Историческая записка о Мозырской прогимназии / сост. К. Шпаковский. Мозырь: тип. Х. В. Кугель, 1909. 150 с.

7. Исторический очерк Гродненской гимназии / сост. Е. Ф. Орловский. Гродно: типо-литография С. Лапина, 1901. 119 с.

8. *Киприанович, Г. Я.* К истории женского образования в Западной России. Вильна: Губ. тип., 1910. 68 с.

9. *Корнилов, И.* Русское дело в Северо-Западном крае. Материалы по истории Виленского учебного округа преимущественно в Муравьевскую эпоху. СПб.: тип. А. Суворина, 1908. Вып. 1. 504 с.

10. ЛГИА. Ф. 576. Воп. 1. Спр. 120.

11. ЛГИА. Ф. 567. Воп. 1. Спр. 653.

12. *Миловидов, А. И.* Участие молодежи Северо-Западного края в мятеже 1863 года и вызванная им реформа местных учебных заведений (по архивным материалам). Вильна: тип. «Русский почин», 1904. 39 с.

13. Народная школа в Государственной Думе // Русская школа. 1907. № 12. С. 1–25.

14. НИАБ. Ф. 2263. Воп. 1. Спр. 1.

15. НИАБ. Ф. 458. Воп. 1 Спр. 124.

16. *Родевич, М.* Белорусские народные школы. Б. м., Б. г. 119 с.

17. *Рождественский, С. В.* Исторический обзор деятельности Министерства Народного Просвещения. 1802–1902. СПб.: Государственная тип., 1902. 785 с.

18. *Самбук, С. М.* Политика царизма в Белорусси во второй половине XIX века. Минск: Наука и техника, 1980. 224 с.

19. *Созонов, М. Л.* Историческая записка Могилевской мужской гимназии. 1809–1909. Могилев: Губ. тип., 1909. 213 с.

20. *Солоневич, Л. М.* Краткий исторический очерк Гродненской губернии за сто лет ее существования, 1802–1902. Гродно: Губ. тип., 1901. 106 с.

21. *Фальборк, Г. А.* Всеобщее образование в России. М.: Тип. т-ва И. Д. Сытина, 1908. 212 с.

22. *Ярушевич, А.* Молодечно и его учебные заведения: К пятидесятилетию Молодечненской учительской семинарии (1864–1914). Вильна: Русский почин, 1914. 70 с.

УДК 338(476)(091)"18/19"(043.3)

# УПЛЫЎ МАДЭРНІЗАЦЫЙНЫХ ПРАЦЭСАЎ НА РАЗВІЦЦЁ ПРАМЫСЛОВАГА ПРАДПРЫМАЛЬНІЦТВА Ў БЕЛАРУСКІХ ГУБЕРНЯХ У ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XIX – ПАЧАТКУ XX ст.

**А. В. Бурачонак**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, burachonak@bsu.by*

Аўтарам выяўлены асноўныя фактары, якія прывялі да трансфармацыі эканамічнага жыцця ў беларускіх губернях. Ахарактарызавана праватворчая дзейнасць урада Расійскай імперыі, якая закранае пытанні арганізацыі прыватнага прадпрымальніцтва і яго падаткаабкладання. Вызначана роля асацыіраванага капіталу і манапалістычных аб'яднанняў у развіцці гандлёва-прамысловага прадпрымальніцтва Беларусі ў канцы XIX – пачатку XX ст. У выніку аўтар прыходзіць да высновы аб тым, што пад уплывам мадэрнізацыйных працэсаў на тэрыторыі Беларусі змяняліся формы і ўмовы

ажыццяўлення прадпрымальніцкай дзейнасці, мяняўся склад удзельнікаў прадпрымальніцтва, узнікалі новыя сродкі вытворчасці і рыначныя інстытуты, якія не замянялі старыя, а дапаўнялі іх.

***Ключавыя словы:*** БССР; гісторыя прадпрымальніцтва; Беларусь; мадэрнізацыя; падаткаабкладанне; гандлёвыя дамы; акцыянерныя кампаніі; прамысловасць; гандаль.

# ВЛИЯНИЕ МОДЕРНИЗАЦИОННЫХ ПРОЦЕССОВ НА РАЗВИТИЕ ПРОМЫШЛЕННОГО ПРЕДПРИНИМАТЕЛЬСТВА В БЕЛОРУССКИХ ГУБЕРНИЯХ ВО ВТОРОЙ ПОЛОВИНЕ XIX – НАЧАЛА XX в.

**А. В. Бурачонок**

*Белорусский государственный университет, пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск, burachonak@bsu.by*

Автором выявлены основные факторы, которые привели к трансформации экономической жизни в белорусских губерниях. Охарактеризована правотворческая деятельность правительства Российской империи, затрагивающая вопросы организации частного предпринимательства и его налогообложения. Определена роль ассоциированного капитала и монополистический объединений в развитии торгово-промышленного предпринимательства Беларуси в конце XIX – начале XX вв. В результате автор приходит к выводу о том, что под влиянием модернизационных процессов на территории Беларуси изменялись формы и условия осуществления предпринимательской деятельности, менялся состав участников предпринимательства, возникали новые средства производства и рыночные институты, которые не заменяли старые, а дополняли их.

***Ключевые слова:*** история предпринимательства; Беларусь; модернизация; налогообложение; торговые дома; акционерные компании; промышленность; торговля.

# THE IMPACT OF MODERNISATION ON PROMOTING INDUSTRIAL ENTREPRENEURSHIP IN THE BELARUSIAN PROVINCES IN THE SECOND HALF OF THE 19$^{th}$ AND BEGINNING OF THE 20$^{th}$ CENTURY

**A. Burachonak**

*Belarusian State University, 4, Niezaležnasci avenue, Minsk, 220030, Belarus, burachonak@bsu.by*

Author revealed main factors that led to transformation of economic life in the Belarusian provinces, characterized Russian Empire Government’s lawmaking affecting organization of private entrepreneurship and taxation. The author revealed role of share capital and monopoly associations in commercial and industrial businesses development in Belarus in the late XIX – early XX centuries. Author concludes that the influence of modernization processes in the territory of Belarus has caused changes in forms and conditions of entrepreneurship as well as the structure and composition of entrepreneurs. This influence has also fostered emergence of new production facilities and market institutions that supplemented existing ones instead of replacing them.

***Keywords:*** history of entrepreneurship; Belarus; modernization; taxation; trading houses; joint-stock companies; industry; trade.

Для эканамічнага развіцця беларускіх губерняў у складзе Расійскай імперыі немалаважнае значэнне мелі працяглыя і няпростыя працэсы дастасавання да існавання ў складзе новай дзяржавы. Складанасць гэтай адаптацыі заключалася ў тым, што недастаткова было простага пераносу расійскай сістэмы інстытутаў, практык, тэхналогій і з'яў на далучаныя ў канцы XVIII ст. беларускія землі; неабходна было ў дадатак да гэтага наладзіць шматузроўневае ўзаемадзеянне паміж наяўным асяроддзем і каштоўнасцямі і мадэлямі развіцця, якія прыўносіліся. Ажыццявіць апошняе ў кароткія тэрміны аб'ектыўна не ўяўлялася магчымым, і, верагодна, таму існаванне Беларусі ў складзе Расійскай імперыі ў канцы XVIII – першай палове XIX ст. характарызавалася своеасаблівым «адарваннем». Аднак ужо ў другой палове XIX ст. ступень рэцэпцыі найбольш важных агульнаімперскіх грамадскіх, эканамічных і палітычных інстытутаў, а таксама сістэмы кіравання дае падставы казаць пра больш значную інтэграванасць беларускіх губерняў у расійскую дзяржаву. Высокая ступень уцягнутасці Беларусі ў агульнарасійскія працэсы стала неабходнай перадумовай і прычынай таго, што рэфарматарскія крокі ўрада, накіраваныя на мадэрнізацыю, няхай і з пэўнымі асаблівасцямі, аказвалі непасрэднае ўздзеянне на эканамічнае развіццё гэтага рэгіёну.

У другой палове XIX – пачатку XX ст. Расійская імперыя, якая стала на шлях мадэрнізацыі, зрабіла рашучы скачок, адным з вынікаў якога з'яўлялася рэзкае павышэнне дзелавой актыўнасці. Да найбольш істотных змен, якія былі звязаны з гэтым працэсам, трэба аднесці трансфармацыю сацыяльнай структуры грамадства, якая, у спалучэнні з імклівым эканамічным развіццём, выклікала да жыцця новыя катэгорыі насельніцтва. На тэрыторыі Беларусі адной з такіх катэгорый былі прадпрымальнікі – эканамічна актыўныя суб'екты, дзейнасць якіх была скіравана на атрыманне сталага прыбытку са сваіх прадпрыемстваў.

Працэсу станаўлення прадпрымальнікаў як новай сацыяльнай катэгорыі на тэрыторыі Беларусі садзейнічала актыўная праватворчая дзейнасць расійскага ўрада. Яшчэ ў канцы XVIII – першай палове XIX ст. была сфарміравана аснова новай сістэмы падаткаабкладання прыватнага прадпрымальніцтва, а таксама прыняты нарматыўна-прававыя акты, якія рэгламентавалі заснаванне, функцыянаванне і спыненне дзейнасці гандлёва-прамысловых прадпрыемстваў. У гэты ж час былі заканадаўча аформлены асноўныя арганізацыйна-прававыя формы (поўныя таварыствы, таварыствы на веры, акцыянерныя і паявыя таварыствы) ажыццяўлення

прадпрымальніцкай дзейнасці [1, с. 252–255]. Акрамя таго, у першай палове XIX ст. адбывалася станаўленне інстытута інтэлектуальнай уласнасці [2], які стымуляваў прадпрымальнікаў шукаць новыя механізмы дасягнення сваіх мэт, што ў выніку магло прывесці да ўдасканалення цэлых прамысловых галін.

Праватворчая дзейнасць у галіне прыватнага прадпрымальніцтва ажыццяўлялася расійскім урадам і ў другой палове XIX – пачатку XX ст. Падчас яе былі ўнесены карэктывы ў заканадаўства, якое рэгламентавала пэўныя пытанні арганізацыі прадпрымальніцкай дзейнасці. З 1880-х гг. пачынаюць прымацца актыўныя спробы па ўрэгуляванні сацыяльна-працоўных адносін. За адносна кароткі тэрмін (1882–1912 гг.) быў прыняты шэраг заканадаўчых актаў, якія рэгламентавалі працягласць працоўнага дня, умовы працы дзяцей і жанчын, абавязкі прадпрымальнікаў па выплаце заробку, вырашэнне працоўных спрэчак, сацыяльнае страхаванне [3]. Акрамя таго, у другой палове XIX ст. істотныя змены зведала падатковая сістэма. Яшчэ ў 1860-я гг. расійскае падаткаабкладанне пераадолела прынцып саслоўнасці, захаваўшы пры гэтым рысы нераўнамернасці ў абкладанні буйных, сярэдніх і дробных прадпрымальнікаў. Гэта праблема ў большай ступені была вырашана ў канцы XIX ст., калі падаткі сталі спаганяцца ў залежнасці ад тыпу і памеру гандлёва-прамысловых прадпрыемстваў [1, с. 256–261].

Безумоўна, усе гэтыя крокі спрыялі павелічэнню дзелавой актыўнасці, што прыводзіла да істотных змен у розных сферах эканамічнага жыцця беларускіх губерняў. Мадэрнізацыя ў прамысловай сферы Беларусі ў гэты перыяд была цесна звязана з індустрыялізацыяй – замяшчэннем ручной рабочай сілы тэхналогіямі, заснаванымі на выкарыстанні неадушаўлёных крыніц энергіі. Разам з тым у канцы XIX – пачатку XX ст. мянялася не толькі тэхнічная аснашчанасць прамысловых прадпрыемстваў; змены адбываліся і ў механізмах ажыццяўлення самой прадпрымальніцкай дзейнасці. Сведчаннем гэтага служыць той факт, што ў парэформенны перыяд у прамысловасці Беларусі ўзрастае колькасць прадпрыемстваў, заснаваных у форме асацыіраванага капіталу. Першапачаткова ў прамысловай галіне беларускіх губерняў распаўсюджанне атрымалі поўныя таварыствы і таварыствы на веры. Да канца XIX ст. у прамысловасці беларускіх губерняў налічвалася дзесяць прадпрыемстваў, якія дзейнічалі ў названай арганізацыйна-прававой форме. У пачатку XX ст. колькасць поўных таварыстваў і таварыстваў на веры ў прамысловай галіне Беларусі нястомна расла. Нягледзячы на крызісныя з’явы ў эканоміцы рэгіёна, да 1905 г. у беларускіх губернях ужо функцыянавала 37 гандлёвых дамоў прамысловага тыпу, а напярэдадні Першай сусветнай вайны іх колькасць дасягнула 133. Такім чынам за два дзесяцігоддзі, з 1892 па 1913 гг., колькасць поўных таварыстваў і таварыстваў на веры ў прамысловай сферы Беларусі павялічылася

больш як у 13 разоў. Разам з тым, у беларускіх губернях не набыла шырокага распаўсюджвання такая форма асацыяцыі капіталу, як акцыянерна-паявыя кампаніі, колькасць якіх у беларускіх губернях у 1892 г. складала 5, а ў 1914 г. – 32 [4, с. 58].

Пачатак XX ст. стаў для прамысловасці Беларусі не толькі часам развіцця асацыіраваных форм прадпрымальніцкай дзейнасці, але і часам распаўсюджвання манапалістычных аб’яднанняў. Адным з першых сярод іх пачаў сваю дзейнасць створаны ў Мінску ў чэрвені 1905 г. Камітэт фабрыкантаў па камісійным продажы запалак. Дадзены сіндыкат аб’яднаў фінансавыя магчымасці Мінскага аддзялення Паўночнага банка (з 1906 г. – Мінскага камерцыйнага банка) вытворчыя магчымасці ўладальнікаў запалкавых фабрык. У склад Камітэту з ліку прадпрымальнікаў пяці беларускіх губерняў увайшлі Б. Саламонаў, якому належалі фабрыкі «Вікторыя» ў Барысаве і «Маланка» ў Мазыры, С. Лур’е, які арандаваў фабрыку «Бярэзіна» ў Нова-Барысаве, І. Гальперын, уладальнік фабрыкі «Прагрэс-Вулкан» у Пінску, браты С. і А. Лур’е, уладальнікі фабрыкі «Дзвіна» ў Дзвінску, І. Дубінбаум і Х. Штэйнберг, уладальнікі фабрыка «Край» у Слоніме. Галоўнай мэтай дадзенага манапалістычнага аб’яднання было распаўсюджванне запалак на ўнутраным і знешнім рынку Расійскай імперыі дзякуючы сувязям, якія былі наладжаны Паўночным банкам. Банк атрымліваў камісію 5 кап. за кожныя 1 000 пачкаў запалак, якія былі рэалізаваны на ўнутраным рынку, і 15 кап. – на знешнім. Гэта была не вялікая страта прыбытку для фабрыкантаў, бо кошт 1 000 пачкаў запалак у той час складаў ад 8 руб. 45 кап. да 8 руб. 80 кап. (у залежнасці ад наймення тавару). Разам з тым, гэта быў добры прыбытак для банку, бо норма продажу на ўнутраным рынку ўсталёўвалася ў памеры 664 тыс. скрынак па 1 000 пачкаў у кожнай, на знешнім – 100 тыс. скрынак. Дзякуючы стварэнню дадзенага камітэту, гаспадары запалкавых фабрык змаглі дастаткова паспяхова канкурыраваць на рынку, распаўсюджваючы збыт запалак на Украіну, Паўночны Каўказ і Закаспійскі край [5, арк. 10–12 адв.; 6, арк. 1–5].

У другой палове XIX – пачатку XX ст. адбываліся змены і ў сацыяльным складзе прамысловых прадпрымальнікаў Беларусі. У першыя парэформенныя дзесяцігоддзі дастаткова моцныя пазіцыі сярод мясцовых прамыслоўцаў утрымлівалі прадстаўнікі дваранскага саслоўя. Аднак ужо да канца XIX ст. сярод уладальнікаў гільдзейскіх прамысловых прадпрыемстваў нароўні з дваранствам аказалася купецтва. У пачатку ж XX ст. доля дваран сярод прамысловых прадпрымальнікаў беларускіх губерняў зменшылася, а лідзіруючыя пазіцыі дасталіся прадстаўнікам гарадскіх саслоўяў – купецтву і мяшчанству. Нягледзячы на тое, што мяшчане па прадстаўніцтве ў гэтай сацыяльнай катэгорыі насельніцтва займалі другое

месца, аб'ём вытворчасці на іх прадпрыемствах быў значна ніжэйшы, чым у дваран [7, л. 87–90].

З павелічэннем колькасці ўладальнікаў прадпрыемстваў з ліку купецтва і мяшчанства змяняецца і тэрытарыяльнае размяшчэнне (з сельскай мясцовасці ў гарадскую) прамысловасці Беларусі. Гэтаму спрыяла распаўсюджванне паравых і іншых відаў рухавікоў, наяўнасць якіх не патрабавала знаходжання прадпрыемства ў зоне дзеяння прыродных сіл – вады і ветра. Мадэрнізацыя транспартнай інфраструктуры, праходжанне праз тэрыторыю Беларусі чыгункі дазволіла засноўваць прамысловыя аб'екты на адноснай аддаленасці ад сыравінных рэсурсаў. Безумоўна, паступоваму пераносу прамысловасці з сельскай у гарадскую мясцовасць садзейнічалі рост беларускіх гарадоў і ўрабанізацыйныя працэсы.

Урбанізацыя з'яўлялася адным з ключавых напрамкаў мадэрнізацыйных працэсаў на тэрыторыі Беларусі ў гэты перыяд. За паўстагоддзя колькасць гарадскога насельніцтва ў беларускіх губернях павялічылася з 523,6 тыс. у 1863 г. да 1,55 млн. чалавек у 1914 г. Пры гэтым доля гарадскіх жыхароў у агульнай структуры насельніцтва Беларусі за гэты ж перыяд вырасла з 11,6 % да 13,4 % [8, с. 312], што сведчыць аб невысокіх тэмпах урбанізацыі на гэтых тэрыторыях. Тым не менш, рост абсалютнага паказчыка колькасці гараджан, якія фарміравалі ўстойлівы попыт на розныя тавары, з'яўлялася адным з каталізатараў змен у інстытуцыянальнай структуры беларускага рынку.

Варта адзначыць, што яшчэ ў 60–70-я гг. XIX ст. у гандлёвай сферы Беларусі трывалыя пазіцыі займалі кірмашы, на якіх заключаліся як аптовыя здзелкі, так і вёўся рознічны гандаль. У апошнія два дзесяцігоддзі XIX – пачатку XX стст. практычна паўсюдна на тэрыторыі Беларусі значэнне кірмашоў пачынае змяншацца. І толькі ў Віленскай губерні ў перыяд з 1883 да 1912 гг. колькасць праведзеных кірмашоў павялічылася з 95 да 315, а тавараварот на іх вырас з 379 тыс. да 1,46 млн. руб. [9, с. 3; 10, с. 7]. Як правіла, кірмашы Віленскай губерні актыўна наведвалі замежныя купцы, якія заключалі аптовыя здзелкі з мясцовымі прадпрымальнікамі.

У іншых беларускіх губернях таксама праводзіліся кірмашы, на якіх ажыццяўляўся аптовы гандаль. У якасці прыкладу можна прывесці Калядны лясны кірмаш у Мінску, на якім напярэдадні Першай сусветнай вайны абароты дасягалі 20 млн. руб. у год. За лесаматэрыяламі сюды прыязджалі буйныя прадпрымальнікі і камісіянеры з паўднёвых губерняў Расійскай імперыі, а таксама з Мемеля, Кёнігсберга і Берліна [11, с. 42]. Варта адзначыць, што правядзенне з 1909 г. Каляднага кірмашу ў Мінску з'яўлялася ініцыятывай біржавога камітэту Мінскай лясной біржы. З'яўленне гэтага прынцыпова новага для тэрыторыі Беларусі рыначнага інстытута ў пачатку XX ст. было абумоўлена менавіта канцэнтрацыяй у Мінску ляснога гандлю. У лістападзе 1904 г. быў зацверджаны статут, а ў маі 1905 г. адбыўся ўстаноўчы сход таварыства Мінскай лясной біржы, на якім быў абраны біржавы камітэт [12,

арк. 122–124]. Аднак паступова стала відавочным немэтазгоднасць існавання дадзенага рыначнага інстытута, паколькі на біржавыя сходы ніхто не з'яўляўся, рэгістрацыі цэн не адбывалася, а здзелкі здзяйсняліся па-за межамі біржы. Вузкая спецыялізацыя біржы з цягам часу не стала адпавядаць эканамічным запытам і патрабаванням прадстаўнікоў мясцовых дзелавых колаў. Прадукцыя мясцовых сельскагаспадарчых і прамысловых вытворцаў у пачатку XX ст. была запатрабавана у Маскоўскім, Варшаўскім, Санкт-Пецярбургскім рэгіёнах, у Паволжжы, Сібіры і на Каўказе. А зараблялі на гэтым замежныя камісіянеры і гандлёвыя пасярэднікі [13, арк. 1–3]. Менавіта таму быў неабходны рыначны інстытут з больш шырокай спецыялізацыяй, які мог бы даць мінскім прадпрымальнікам інфармацыю адносна цэн і попыту на пэўныя тавары на адпаведных рынках. У сувязі з гэтым, у 1912 г. «па найвышэйшай згодзе» Міністра гандлю і прамысловасці і губернскага кіраўніцтва Мінская лясная біржа была пераўтворана ў агульнатаварную, па прыкладзе іншых 115 гандлёвых і ўніверсальных бірж, якія існавалі ў той час у Расійскай імперыі [14, арк. 19].

У аптовым гандлі беларускіх губерняў у канцы XIX – пачатку XX ст. істотнае месца сталі займаць гандлёвыя дамы. Як і ў прамысловай галіне Беларусі іх колькасць увесь час павялічвалася. Так, у 1892 г. у гандлёвай сферы беларускіх губерняў налічвалася 14 поўных таварыстваў і таварыстваў на веры, у 1905 г. – 55, у 1913 г. – 305. Такім чынам, колькасць гандлёвых дамоў у гандлі Беларусі з 1892 па 1913 гг. павялічылася практычна ў 22 разы, у той час як у прамысловасці – толькі ў 13 разоў. Разам з тым гандляры Беларусі не актыўна асвойвалі вышэйшыя формы асацыіравання капіталу. Так, у 1905 г. сярод 25 акцыянерна-паявых кампаній, якія існавалі ў беларускіх губернях, у гандлёвай сферы дзейнічала выключна адно прадпрыемства. Напярэдадні Першай сусветнай вайны сітуацыя не моцна змянілася – з 37 акцыянерна-паявых кампаній гандлёвых налічвалася толькі тры [4, с. 58].

Такім чынам, мадэрнізацыйныя працэсы, якія мелі месца ў Расійскай імперыі, у значнай ступені паўплывалі на развіццё прамысловага прадпрымальніцтва ў Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX ст. Пад іх уплывам змяняліся формы і ўмовы ажыццяўлення прадпрымальніцкай дзейнасці, мяняўся склад удзельнікаў прадпрымальніцтва, узнікалі не толькі новыя сродкі вытворчасці, але і рыначныя інстытуты, якія не замянялі старыя, а дапаўнялі іх.

## Бібліяграфічны спіс

1. *Бурачонак, А. В.* Прадпрымальніцтва. Удзел замежных прадпрымальнікаў і фінансістаў у развіцці прамысловасці і транспарту // Сацыяльна-эканамічнае развіццё Беларусі (канец XVIII – пачатак XX ст.) / В. В. Яноўская [і інш.]; рэдкал.: В. В. Даніловіч [і інш.]; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т гісторыі. Мінск : Беларуская навука, 2020. С. 252–276.

2. *Бурачонак, А. В.* Станаўленне інстытута аховы інтэлектуальнай уласнасці прадпрымальнікаў на тэрыторыі Беларусі ў XIX ст. // Пічэтаўскія чытанні – 2019:

універсітэцкая навука і гістарычная адукацыя ў Беларусі XX – пачатку XXI ст. Да 85-годдзя стварэння гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта : матэрыялы міжнар. навук.-практ. канф., Мінск, 23–24 кастр. 2019 г. / Беларус. дзярж. ун-т ; рэдкал. : А. Г. Каханоўскі (старш.) [і інш.]. – Мінск: БДУ, 2019. С. 106–110.

3. *Бурачонак, А. В.* Прававое рэгуляванне сацыяльна-працоўных адносін на фабрычна-заводскіх прадпрыемствах Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX ст. // Крыніцазнаўства і спецыяльныя гістарычныя дысцыпліны. 2012. Вып. 7. С. 80–89.

4. *Бурачонак, А. В.* Распаўсюджванне асацыіраванага капіталу на тэрыторыі Беларусі ў канцы XIX – пачатку XX ст. // Часопіс Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Гісторыя. 2017. № 2. С. 54–61.

5. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). Ф. 454. Воп. 1. Спр. 4.

6. НГАБ. Ф. 454. Воп. 1. Спр. 6.

7. *Бурачонак, А. В.* Развіццё прадпрымальніцтва ў фабрычна-заводскай вытворчасці Беларусі (1861–1914 гг.): дыс. … канд. гіст. навук. Мінск, 2012. 151 л.

8. *Каханоўскі, А. Г.* Сацыяльная трансфармацыя беларускага грамадства (1861–1914 гг.). Мінск: БДУ, 2013. 335 с.

9. Обзор Виленской губернии за 1883 год. [Б. м.], [б. г.]. [3], 30, [39] с.

10. Обзор Виленской губернии за 1912 год. Вильна, 1913. [5], 100, [56] с.

11. *Канделаки, И.* Роль ярмарок в русской торговле. СПб.: тип. ред. период. изд. Министерства финансов, 1914. 60 с.

12. Расійскі дзяржаўны гістарычны архіў. Ф. 23. Воп. 25. Спр. 135.

13. НГАБ. Ф. 363. Воп. 1. Спр. 67.

14. НГАБ. Ф. 1. Воп. 1. Спр. 6109. Арк. 1.

УДК 349.412(476)(091)+347.235(476)(091)

# ВЛИЯНИЕ БУРЖУАЗНЫХ РЕФОРМ НА ФУНКЦИОНИРОВАНИЕ МАЙОРАТОВ НА ТЕРРИТОРИИ БЕЛАРУСИ ВО ВТОРОЙ ПОЛОВИНЕ XIX в.

**А. Е. Веремейчик**

*Белорусский государственный университет, пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск, Verameichyk@bsu.by*

В работе проанализированы основные законодательные акты, определявшие политику правительства Российской империи в отношении функционирования майоратов, как самой крупной наследуемой земельной собственности на территории Беларуси в XIX в. Выявлены формы его правового регулирования. Автором доказана отсутствие экономической перспективы майоратных владений в период реализации буржуазных реформ и развития капитализма во второй половине XIX в., выявлены особенности в реализации законодательства о распоряжении помещичьими имениями на территории Беларуси. На основе принципов диалектического метода (историзм, конкретность, научная объективность) и введения в научный оборот архивных материалов автор показала влияние внутриполитической ситуации и буржуазных реформ на белорусских землях на реализацию ряда законов по упорядочению частновладельческого земельного права. Автор определила, что на территории Беларуси постепенно происходила адаптация законодательства в области частного земельного права к капиталистическим отношениям.